Яніна
Грыневіч

навуковы супрацоўнік ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі», кандыдат філалагічных навук
(г. Мінск, Беларусь)

# Патэнцыял вясельнай абраднасці Беларускага Падзвіння ў развіцці агра- і экатурызму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Духоўная спадчына беларускага народа, якая на сучасным этапе ва ўмовах глабалізацыі захоўвае сувязь з гістарычнай памяццю і дапамагае захаваць нацыянальна-культурную ідэнтычнасць, з'яўляецца асновай, падмуркам для развіцця нацыянальнай культуры і пры гэтым, нароўні з культурай матэрыяльнай, важным складнікам развіцця агра- і экатурызму.

Гісторыка-этнаграфічны рэгіён Беларускае Падзвінне, што ахоплівае тэрыторыі Полацкага, Расонскага, Верхнядзвінскага, Міёрскага, Браслаўскага, Шаркаўшчынскага, Пастаўскага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Лепельскага, Ушацкага, Чашніцкага, Бешанковіцкага, Сенненскага, Талачынскага, Гарадоцкага, Віцебскага, Лёзненскага, Аршанскага, Дубровенскага, Шумілінскага раёнаў, на сучасным этапе, як зазначаюць даследчыкі, вызначаецца высокай ступенню захаванасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны [2]. У межах рэспублікі яна характарызуецца наяўнасцю не толькі агульнанацыянальных рыс, але і рэгіянальных і лакальных асаблівасцей, якія робяць яе адметнай і самабытнай і з'яўляюцца асновай для развіцця агра- і экатурызму.



Выяўленне найбольш выразных і характэрных элементаў духоўнай спадчыны беларусаў Падзвіння, якія рэпрэзентуюць культурна-гістарычныя асаблівасці рэгіёна і іх носьбітаў, дазволяць вызначыць найбольш перспектыўныя для развіцця агра- і экатурызму канкрэтныя тэрыторыі (раёны) Беларускага Падзвіння.

У пачатку XXI ст. на ўсёй тэрыторыі Беларускага Падзвіння дастаткова актыўна бытуе як пазаабрадавы, так і абрадавы фальклор. Пазаабрадавы фальклор, які ўключаны ў рэперуар асобных выканаўцаў, груп выканаўцаў і фальклорных калектываў з улікам сваёй спецыфікі — непрымеркаванасці да пэўнага этапу абраду, часу, дзеяння, руху, — мае значны патэнцыял для выкарыстання ў сферы агра- і экатурызму. Таксама дастаткова шырока на тэрыторыі гісторыка-этнаграфічнага

рэгіёна прадстаўлены абрады каляндарнага і сямейнага цыклаў. Каляндарныя абрады, функцыянальна скіраваныя на рэгламентацыю жыцця чалавека традыцыйнага грамадства ў аспекце свят і працоўнай дзейнасці на працягу года, з'яўляюцца найбольш перспектыўнымі для выкарыстання ў сферы агра- і экатурызму. Абрады сямейнага цыкла, якія сімвалічна афармляюць асабістае жыццё чалавека, носяць больш прыватны характар і таму ў меншай ступені адпавядаюць турыстычным патрэбам. Выключэннем тут стала вяселле — комплекс абрадаў і звычаяў у спалучэнні са шматлікімі фальклорнымі элементамі (песнямі, музыкай, танцамі, гульнямі, прыгаворамі і інш.), якія суправаджаюць урачыстасць заключэння шлюбу і з'яўляюцца няпісаным юрыдычным актам зацвярджэння новай сям'і [1, 303].

Лакальныя асаблівасці вясельнай абраднасці Беларускага Падзвіння прадстаўлены на абласным аглядзе-конкурсе вясельных абрадаў Віцебшчыны «Вялікая вясельніца». Праграма свята складаецца з дзвюх частак. Першая — рэканструкцыя вясельнага абраду пачатку XX ст., зробленая на аснове фальклорных матэрыялаў Дубровенскага, Гарадоцкага і Лёзненскага раёнаў, у час якой адбываецца непасрэднае знаёмства турыстаў з традыцыйным укладам жыцця сельскага насельніцтва названага перыяду ў межах захаваных натуральных ландшафтаў. Рэканструкцыя вясельнага абраду ахоплівае такія этапы, як прыезд дружыны маладога да маладой, выпраўленне маладых да шлюбу, кіданне зайца, пераезд да маладога, вясельнае застолле, падзел каравая, дарэнне маладым і інш.



У другую частку праграмы мерапрыемства ўваходзіць конкурсны прагляд элементаў традыцыйнага вясельнага абраду Віцебшчыны, што праходзіць у цэнтры культуры г. Дуброўна. У канцэртнай праграме прадстаўлены элементы вясельнага абраду і традыцыйныя вясельныя гульні і танцы. На сцэне абласнога агляду-конкурсу «Вялікая вясельніца–2015» былі прадстаўлены наступныя элементы вясельнай абраднасці: сватаўство на Віцебшчыне (народны ансамбль народнай песні «Сябрына» КГК «Залатое кола г. Віцебска "Дзвіна"»), зборная субота (народны самадзейны фальклорны калектыў «Крыніца» Бачэйкаўскага СДК Бешанковіцкага р-на; вакальны ансамбль «Сакавіца» Бягомльскай ДШМ Докшыцкага р-на), паненскі вечар (фальклорны гурт «Купалінка» Каўшэлеўскага ДФ Шаркаўшчынскага р-на), выпяканне вясельнага караваю (народны клуб нацыянальнай кухні «Гаспадынька» аўтаклуба ДУК «Аршанскі ГЦК "Перамога"»), прыбіранне маладой да вянца (народны фальклорны калектыў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Матырынская спадчына» і калектыў-спадарожнік Матырынскага СК Ушацкага р-на), выкуп, ад’езд да вянца (фальклорны гурт «Язынка» Язненскага СДК ДУК «Міёрская ЦКС»), пасаг маладой, выкуп маладой (народны фальклорны калектыў «Гульбічы» ДУК «Шумілінскі раённы цэнтр культуры»), сустрэча маладых на дарозе (народны ансамбль народнай музыкі і песні «Крынічанька» ДУК «Палац культуры г. Барань»), абразанне касы (народны гурт архаічных спеваў «Княжыч» Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры г. Наваполацка), выкрадан-не курыцы (народны фальклорны калектыў «Крыніца» Янкавіцкага сельскага Дома культуры Расонскага р-на), перазовы (народны фальк-лорны клуб «Кругаверць» ДУК «Лепельскі РДК»), супраткі (народны фальклорны калектыў «Суседзі» Аболецкага Дома фальклору Талачынскага р-на).

У другой частцы праграмы былі прадстаўлены наступныя танцы і гульні: гульня «Выкуп нявесты», танец «Мяцеліца» (тэатр гульні «Праяўленне» РДК ДУК «Раённы цэнтр народнай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці Дубровенскага р-на»), гульні «Пояс-пацалунак», «Бабыль», «Чапяла», танцы «Каханачка», «Падыспань», «На рэчаньку», «Яблычка» (народны фальклорны гурт «Кругаверць» ДУК «Лепельскі раённы Дом культуры»), гульня «Знаёмства званых гасцей», танец «Мяцеліца» (народны фальклорны калектыў «Медуніца» Адаменскага СДК ДУ «Лёзненская раённая цэнтралізаваная сістэма»), вясельная гулянка з прыпеўкамі, танцы «Барыня ўпрысядку», «Вясельная полька» (народны фальклорны калектыў «Крыніца» Янкавіцкага СДК ДУК «Расонскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці»), гульні «Фанты», «Ручаёк» (творчы калектыў «Бродячие артисты» аўтаклуба ДУК «Талачынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці»), «Гульня з хусткай» у складзе гульні «Кракавяк», «На рэчаньку» (народ-ны ансамбль народнай песні «Ульчанка» Чашніцкага РДК), гульня «Частаванне вясельным караваем», танцы «Кракавяк», «Падыспань», «Лысы» (народны фальклорны калектыў «Гульбічы» ДУК «Шумілінскі раённы цэнтр культуры»), танцы «Лявоніха», «Лысы», «Полька», «На рэчаньку» (народны гурт архаічных спеваў «Княжыч» цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры г. Наваполацка).

Акрамя таго, у час правядзення абласнога агляду-конкурсу вясель-ных абрадаў Віцебшчыны «Вялікая вясельніца–2015» праходзіла выстава «Імгненні лёсу», на якой былі прадстаўлены фотаздымкі з сямейных архіваў, вясельныя строі і атрыбутыка, характэрныя для Віцебшчыны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба адзначыць, што праграма першага аддзялення свята-конкурсу складзена адпаведна абрадавай канве, што дазваляе стварыць дастаткова поўнае ўяўленне аб традыцыйным вясельным абрадзе ў рэгіёне. Немалаважна і тое, што ад удзельнікаў мерапрыемства ў першую чаргу патрабавалася прадставіць на сцэне менавіта аўтэнтычны лакальны варыянт пэўнага элементу вясельнага абраду, а не яго інтэрпрытацыі/варыяцыі. Безумоўна, не ўсе ўдзельнікі змаглі ў поўнай меры выканаць пастаўленую задачу, тым не менш лакальная спецыфіка вяселля была ў дастатковай меры прадэманстравана. Па выніках правядзення абласнога агляду-конкурсу вясельных абрадаў Віцебшчыны «Вялікая вясельніца–2015» найлепшыя ўдзельнікі былі ўзнагароджаны Гран-пры, дыпломамі I, II і III ступеняў, а таксама былі адзначаны найлепшыя выканальнікі абрадавых вясельных спеваў і танцаў. Гэта стымулюе цікавасць да рэканструкцыі менавіта аўтэнтычных элементаў абраду, характэрных для іх мясцовасці.

Такім чынам, на прыкладзе конкурсу вясельных абрадаў Віцебшчыны «Вялікая вясельніца» паказана, што такая значная частка сямейнай абраднасці беларусаў, як вяселле ў Беларускім Падзвінні, мае значны патэнцыял для развіцця агра- і экатурызму. Абласны агляд-конкурс дазваляе не толькі непасрэдна пазнаёміцца з традыцыйным укладам жыцця сельскага насельніцтва ў пачатку XX ст. на прыкладзе рэканструкцыі вяселля, але і ўбачыць элементы вясельнай абраднасці Віцебшчыны ва ўсёй лакальнай разнастайнасці.



*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. *Малаш, Л. А.* Вяселле / Л. А. Малаш // Беларускі фальклор : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск, 2005. — Т. 1. — С. 303—307.
2. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. — Мінск : Беларус. навука, 2001—2013. — Т. 2 : Віцебскае Падзвінне. — Мінск : Беларус. навука, 2004. — 910 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ